





Горацкая газета
№22
24 траўня 2007
Узгорак
Кошт свабодны




В свободное время волейбол - лучший отдых

Туристы снова в Полящицах

В среду и четверг в Полящицкой роще проходил районный туристический слет школьных команд

На живописном берегу озера собрались лучшие туристы из восемнадцати школ Горецкого района. В первый день участники младшей группы соревновались в ориентировании на местности, а старшие проходили полосу препятствий.

Результаты в ориентировании:
1.Юрковская СШ–45 мин. 42 с.
2.Каменская СШ – 47.20
3.Паршинская СШ – 48.43
4.Шишевская СШ – 53.27
5.Совская СШ – 1 час 00.20
6.Овсянковская СШ – 1.09.58
7.Селецкая БШ – 1.15.05
8.Становская БШ – 1.19.50
9.СШ №1 – 1.29.40
10.Коптевская СШ – 2.11.50

Любопытно, что высокие места заняли в основном небольшие сельские школы, а подготовка городских команд в этом случае оставляла желать лучшего. Справедливости ради надо упомянуть, что гимназия в этом возрасте не участвовала.

На этом фоне заметен успех двух базовых школ, которые также сумели обойти и городские команды и ряд крупных сельских школ. Лучше других здесь выступили ребята из Сельца, которых готовил недавно пришедший в эту школу Роман Сапсай. Эта фамилия в "Овсянковском регионе" известна и, как видим, продолжает приносить результаты.

На полосе препятствий соревновались только средние школы. Результаты лидеров:
1.СШ №3 – 15.57
2.Шишевская СШ – 19.17
3.СШ №2 – 26.52
4.Совская СШ – 28.33
5.Коптевская СШ – 28.42.

Как видим, здесь городские школы восстановили свой престиж, а результат победителя, команды третьей школы, прошедшей дистанцию почти без штрафов, главный судья соревнований Иван Сапсай назвал просто прекрасным. Для сравнения – команда, занявшая последнее место имеет результат 45.22

Окончательные результаты – в следующем номере.

Иван МОРОЗОВ

ПЯТАЯ КАЛОНКА

НАСКОЛЬКО ОЩУТИМОЙ БУДЕТ ДЛЯ ВАС ОТМЕНА ЛЬГОТ?

С этим вопросом мы обратились к прохожим на улицах города

Виктор, рабочий:
- Я никакими льготами не пользуюсь, поэтому лично меня это не коснется. А вот родители могут пострадать, так как они уже на пенсии.

Антонина Ивановна, пенсионерка:
- Конечно, мне будет тяжелее, но если всей стране трудно, то можно и потерпеть.

Ольга Ивановна, молодая мама:
- Я пока ничего не знаю об отмене, но вряд ли льготы заберут у тех, кто в них действительно нуждается.

- Дмитрий, студент:
- Я скоро закончу академию, поэтому меня это не коснется.

Олег и Елена, студенты 1-го курса:
- Ощутимой отмена льгот будет для наших родителей, ведь мы сами мало что зарабатываем – разве что стипендию. Но есть люди, которым будет совсем тяжело, например – одинокие пенсионеры, или студенты, у которых родители живут бедно.

Татьяна, педагог:
- Вы только фамилию мою не пишите. Им там все мало. Деньги, которые сэкономят на льготах, тоже пойдут неизвестно куда – на всякие "Дожинки". А у меня в классе есть несколько детей, которых родители нормально прокормить и одеть не могут, причем это не пьяницы, просто у них работа за копейки. Не стыдно нашим депутатам у таких забирать последнее?

Дмитрий Владимирович, просто прохожий:
- Сейчас ощутимой не будет – дети уже выучились, я и жена работаем, неплохо получаем. Но скоро нам на пенсию. Вот тогда и ощутим отмену.

Ольга, служащая:
- Кому-то будет хуже, кому-то может и лучше. Моя семья немного пострадает, так как двое детей ездят в школу на автобусе.

Николай, студент:
- Что-то об этом слышал, но если и отменят льготы на проезд студентам, то я лично езжу домой редко, стараюсь здесь подрабатывать. Как – не скажу, это такой "серый" бизнес. И когда получу диплом, то у государства тоже ничего просить не буду. Отвертчусь как-нибудь от "распредухи" и открою свое дело.

Беседовал Иван МОРОЗОВ

ТРЕБУЮТСЯ НА РАБОТУ

Мнение экономиста

Новые друзья, или повезет ли битый небитого?

Именно такая мысль возникает, когда оцениваешь последние заявления наших высших госчиновников по итогам визита в Беларусь президента Ирана Ахмадинижада. В самом деле, это большая по площади (в восемь раз больше Беларуси) и по населению (более 70 миллионов жителей) страна. Однако мощной экономики после длительной кровавой войны с Ираком в 80-е годы прошлого столетия там построить так и не удалось. Валовый внутренний продукт на одного жителя в Иране составляет 8400 долларов, из которых почти половину обеспечила нефтегазовая отрасль. Этот уровень хотя и немного больше нашего, но не идет ни в какое сравнение с уровнем развитых стран. Для сравнения: Германия имеет ВВП около 30000 долларов на человека, Чехия – 18000, США – 42000, Эстония – 16000, Россия – 12000. А если учитывать объемы сбережений и банковского капитала, то Иран и вообще – голытьба. Главное, что сегодня интересует в Иране белорусских стратегов, это – нефть. И это главная проблема наших, воспитанных в худших советских традициях материализма высших государственных менеджеров. Ведь похоже, что наши правители не представляют себе, как можно заработать, не только что-либо выкопав из земли, либо продав какой-нибудь трактор, или грузовик. Сегодня весь мир зарабатывает наибольшие прибыли, торгуя идеями, капиталами, изобретениями.

Но политика самоизоляции не позволяет нашей стране присоединяться к мировым течениям, в русле которых оборачиваются финансы и технологии, принося своим владельцам выгоду. Потому и остается нам дружить с такими "самоизгоями", выбирая из них тех, кто побогаче на ресурсы (с близкой по духу, но не имеющей ископаемых Северной Кореей у нас почему-то дружба не складывается).

Заявленные нашими компаниями планы добычи нефти в Иране на ближайшие годы – 1,5 миллиона тонн – вызывают у экспертов большие сомнения, поскольку для добычи такого количества "черного золота" нужны вложения объемом не менее 2-3 миллиардов долларов, которые окупаются только спустя 7-10 лет. Собственных денег на это Беларусь не имеет, а для Ирана, который уже выделил нефтяные месторождения, еще и финансировать их разработку было бы сумасшествием.

В недрах правительства сразу же возникла идея разрабатывать иранскую нефть за китайские деньги, т.е. – взять у Китая кредит! Помните, еще недавнюю "лихорадку" с обещанными Китаем миллиардами? Сколько было шума после визита Александра Лукашенко в Китай, который, по словам наших правителей, обещал едва ли не засыпать нас дружественными миллиардами! А воз и ныне там. И причиной тому – не враждебность китайских коммунистов, а их образовательный и интеллектуальный уровень. Дело в том, что в последние десятилетия сотни тысяч китайских студентов (в основном – дети партноменклатуры) учились в лучших ВУЗах Европы, Америки, Японии. И сегодняшняя китайская элита за ширмой коммунистической идеологии проводит в жизнь прагматический экономический курс, который абсолютно не стыкуется с нашим, где все наоборот: ширма – либеральная, а по сути – пещерный коммунизм.

Поэтому, ощущая наступающие экономические проблемы, наши верхи сегодня лихорадочно ищут хоть какой-то выход (типа – "заграница нам поможет"). Но без разрешения "сверху" на реформы внутри страны, все эти усилия обречены на провал. А те деньги, что мы сегодня теряем из-за самоизоляции, еще долго будут "бить" по нашим детям и внукам, которые недобрым словом вспомнят нынешнее бестолковое время.

И докуда эта дурость будет тянуться, и не стыдно ли нам будет смотреть в глаза потомкам, будет зависеть только от нас, уважаемые обыватели.

Андрей ЮРКОВ, тел. 623 61 08

"Белтрансгаз" праданы. Хто наступны?

Эпапея з продажам 50% акцыяў "Белтрансгазу" расейскаму манапалісту "Газпраму" нарэшце скончылася. У пятніцу вечарам бакі падпісалі пагадненьне аб перадачы да 2010 году паловы беларускіх актываў.

Кошт гэтай зьдзелкі — 2,5 мільярды даляраў, якія расейскі канцэрн павінен часткамі пералічыць беларускаму боку за чатыры гады, пачынаючы з 2007-га. У гэтым годзе Беларусь мусіць атрымаць ад "Газпраму" 625 мільёнаў даляраў. Столькі каштуе 12,5% пакету "Белтрансгазу". Але рэальныя грошы беларускія улады наўрад ці пабачаць, бо запазыка за скарыстаны газ толькі за чатыры месяцы склала каля 400 мільёнаў даляраў.

Сёньня падчас прэсавай канфэрэнцыі віцэ-прэмьер Уладзімер Сямашка сказаў журналістам, што беларускі бок задаволены вынікамі перамоваў, якія йшлі цягам трох гадоў. Паводле віцэ-прэмьера, гэта толькі першы крок па стварэньні сумеснага газатранспартнага беларуска-расейскага прадпрыемства.

Аналітыкі па-рознаму ацэньваюць вынікі перамоўнага працэсу. На думку эканамічнага аглядальніка штотыднёвіка "Беларусы й рынак" Тацяны Манёнак, беларускі бок выявіў якасьці добрага перамоўшчыка. Афіцыйны Менск гандляваўся з Расеяй да апошняга. Крамлю нават прыйшлося дзеля таго, каб зварухнуць справу зь мёртвай кропкі, прыбегнуць да нафтагазавага шантажу. За тое й выгадалі беларусы нямала. Такіх спрыяльных умоваў продажу часткі газатранспартных актываў ня мела ніводная з краінаў былога Савецкага Саюзу, у якіх расейскі манапаліст выкупляў газавыя трубы.

Манёнак:"Умовы, якія выгандлявала Беларусь, вельмі выгодныя дзеля беларускага боку і, канечне, нявыгадныя дзеля Расеі. "Газпрам" адразу ж ставіў пытаньне мець калі не кантроль, то львіную долю акцыяў на пачатку. Але ў выніку было падпісанае фьючэрзнае пагадненьне, расцягнутае на чатыры гады. І вось цягам гэтага пэрыяду расейскі бок ня будзе мець магчымасьцяў карпаратыўнага кіраваньня ў сумесным прадпрыемстве".

Тацяна Манёнак адзначыла таксама, што разам зь вялікімі грашыма беларускі бок дамовіўся з "Газпрамам" пра больш эфэктыўнае выкарыстоўваньне магутнасьцяў сваёй газатранспартнай сыстэмы. Гэта таксама прынясе ў бюджэт дадатковыя прыбыткі.

Манёнак: "І да таго ж трэба разумець, што такі даволі пазытыўны фон гэтых перамоваў дазволіў спадару Сямашку зрабіць заяву, што, магчыма, зараз больш актыўна пойдуць перамовы па выдзяленьню Беларусі стабілізацыйнага крэдыту. І міністар фінансаў Расеі спадар Кудрын дзесьці за мяжою ўжо сказаў, што такія магчымасьці ёсьць, і, магчыма, Расея хуткім часам такі крэдыт Беларусі дасьць".

А вось былы кіраўнік Нацыянальнага банку Беларусі Станіслаў Багданкевіч бачыць вынікі перамоваў з "Газпрамам" ня так аптымістычна. На ягоную думку, Беларусь, хоць і выгандлявала дзеля сябе грашовую перавагу, але затое прайграла стратэгічна.

Багданкевіч: "Вынікі продажу "Белтрансгазу" асабіста я ацэньваю ня вельмі высока. Кошт за яго ўзялі высокі, але калі ўлады насамрэч непакоіліся пра незалежнасьць краіны, то павінны былі акцыі "Белтрансгазу" прадаваць ня толькі Расеі, але й заходнім кампаніям. Калі б гэта было прадпрыемства з удзелам, напрыклад, і нямецкага, і расейскага, і беларускага капіталу, то гэта, на маю думку, было б стратэгічна больш разумна".

Падчас прэс-канфэрэнцыі Уладзімер Сямашка таксама заявіў, што продаж акцыяў "Белтрансгазу" — гэта першы сур'ёзны крок дзеля далейшага продажу акцыяў беларускіх прадпрыемстваў на міжнародным рынку. Плянуецца, што ўжо да канца бягучага году акцыі шэрагу айчынных прадпрыемстваў, у тым ліку й нафтахімічнага комплексу, будуць выстаўленыя на продаж. Тацяна Манёнак лічыць, што перш за ўсё з малатка пойдуць бровaрныя прадпрыемствы.

Манёнак: "Калі магчыма, то гэта перш за ўсё нашыя бровaрныя прадпрыемствы. Яны ўжо падрыхтаваныя да продажу, і урад нават пагадзіўся з магчымасьцю прыцягненьня ў гэтую галіну замежных інвэстыцыяў. І гэта не сакрэт".

Акрамя таго, на продаж могуць быць выстаўленыя цэмэнтавыя заводы, на якія дзяржава спадзяецца прыцягнуць замежныя інвэстыцыі.

Эканаміст Міхась Залескі лічыць, што маштабнай прыватызацыі ў гэтым годзе чакаць ня трэба, бо падрыхтоўка дзяржаўнай маёмасьці да продажу — даволі складаны працэс, на які патрэбныя і час, і грошы.

Залескі: "Дзеля таго, каб гэта пачало працаваць, патрэбна, па першае, адпаведная заканадаўчая база па прыватызацыі. Яна ў свой час распрацоўвалася пры дапамозе міжнародных кансалтынгавых кампаніяў. Па-другое, трэба яшчэ падрыхтаваць гэтыя прадпрыемствы. А гэта вельмі ня проста. І на тое патрэбныя выдаткі. Можна, канечне, па-бальшавіцкі наўскідку іх узяць і прадаць. Але не варта гэта рабіць".

Станіслаў Багданкевіч увогуле ўпэўнены, што нічога сур'ёзнага, акрамя "Белтрансгазу", беларускія ўлады пакуль прадаваць не зьбіраюцца. Ён нагадаў, што тыдзень таму Лукашэнка падчас нарады зь кіраўніцтвам ураду падкрэсьліў, што дзяржава будзе трымаць курс на захаваньне буйных стратэгічных прадпрыемстваў у сваіх руках.

Багданкевіч: "Акрамя таго, у фінансавым пляне беларуская эканоміка не падштурхоўваецца да гэтага. Нафту мы атрымоўваем па коштах на 100 даляраў таньней, чым яе сусьветная цана. Газ таксама. Таму, мне падаецца, да агульнай прыватызацыі няма пабуджальных матываў".

Трэба таксама не забывацца на тое, што пасьля продажу паловы акцыяў "Белтрансгазу", Расея стане больш лаяльнаю й па пытаньні выдзяленьня Беларусі стабілізацыйнага крэдыту. Гэта таксама дасьць кіраўніцтву краіны перадых і дазволіць нейкі час вырашаць эканамічныя праблемы бяз масавага продажу маёмасьці

.

Кастусь Вансяцкі, Радыё Свабода

Курсы валют на 24 траўня

	Аграпрамбанк	Беларусбанк	Белінвестбанк	Нацбанк	за тыдзень
Даляр ЗША	2140-2165	2135-2155	2135-2160	2145	0
Еўра	2890-2970	2850-2950	2850-2910	2878,91	- 38,29
Расейскі рубель	78-83,6	79-83,5	78-84	82,83	- 0,51
Грыўна	380-480	360-440	350-450	427,21	- 0,34
Ангельскі фунт		3850-4250		4234,66	- 26,28
Злоты	660-780	680-780		758,38	- 12,7

Здесь Вы можете подать бесплатное объявление, поздравление, соболезнование, рекламу и другую информацию в газету «УзГорак»:
- Мини-рынок БГСХА по будним дням с 10 до 16.00
- Рынок г.Горки по субботам и воскресеньям с 9 до 14.00



Благотворительность

Якубович добрался до Якутска

ГОРЕЦКИЙ МУЗЫКАНТ И ОБЩЕСТВЕННЫЙ ДЕЯТЕЛЬ ПРЕОДОЛЕЛ НА ПРОСТОРАХ СИБИРИ БОЛЕЕ ДВАДЦАТИ ТЫСЯЧ КИЛОМЕТРОВ

За три неделе пребывания в Республике Саха (Якутия) и других сибирских регионах Владимир провел 33 сольных выступления. Это были благотворительные концерты в домах инвалидов, профилакториях, а также на площадях городов Якутска и Тайшета.

В России Якубович находился по приглашению христианской церкви "Благословение".

Одной из точек, куда довелось попасть, был поселок Батагай Верхоянского района, где, как известно, находится Полюс холода. Там с успехом прошли три выступления.

Еще одно характерное для нашего восточного соседа место – поселок Таастаах, к которому не ведет ни одна дорога.

- Пришлось 150 километров добираться по бездорожью на джипе. После этого оценил наши дороги, которые принято ругать. Но после знакомства с якутскими условиями этого делать не хочется, - рассказывает Владимир.

В ходе турне музыканту довелось поучаствовать и в акции по пропаганде здорового образа жизни, когда на средства, заработанные в ходе благотворительного концерта, был приобретен спортивный инвентарь для туберкулезной больницы. Как обычно, уделил он внимание и борьбе с наркотиками. Для активиста общественного объединения "Матери против наркотиков" не впервые выступать перед заключенными. В поселке Базой Иркутской области зрительницами Владимира были женщины, оказавшиеся за решеткой по причине употребления или торговли "дурью".

В своих выступлениях не забывал Якубович и о пропаганде христианских ценностей:

- В Якутии процветает шаманство, люди суеверные, верования зачастую перемешаны так, что трудно понять, какому Богу человек молится. Поэтому работы по духовному просвещению там – хоть отбавляй.



Одевать Якубовичей в национальные костюмы — добрая российская традиция

Всего же, как подсчитал Владимир, он провел только в самолетах 24 часа, "намотав" при этом около 20 000 километров. Да и маршрут Горки-Москва-Якутск-Батагай-Иркутск-Тайшет-Красноярск-Москва-Горки впечатляет.



И это еще не все.

Дает все больше плодов и работа, которую горецкий музыкант ведет в качестве преподавателя. Недавно его ученик, семнадцатилетний Олег Воронов, занял второе место на областном телеконкурсе "Лестница в небо", который транслирует по пятницам телеканал "ЛАД".

Иван МОРОЗОВ

СПОРТ В БГСХА

ЗООФАК СНОВА ПЕРВЫЙ

Завершилось первенство БГСХА по футболу среди факультетских команд. В финале четыре сильнейших коллектива провели по две игры, а еще по одному результату было зачтено из группового турнира (так называемые личные матчи).

Итоговая таблица:

М	К	Р/М	О
1.	ЗИФ	5-2	7
2.	Земфак	9-3	6
3.	Экфак	7-5	4
4.	Агрофак	1-12	0

ЗЕМФАК СЫГРАЛ БЕЗ ПОРАЖЕНИЙ

В женском первенстве Академии по баскетболу участвовали шесть команд. Поэтому провести турнир решено было по круговой системе. В итоге первое место, победив во всех играх, занцяла команда Земфака. В игре, ставшей решающей, чемпионки победили команду занявшего второе место БиПфака. За два оставшихся места в тройке спорили три команды: БиП, Бухфак и Агроэк. В результате, набрав по 8 очков, они по дополнительным показателям разместились в таблице в такой последовательности.

НА УНИВЕРСИАДЕ

Сборная БГСХА по легкой атлетике выступила на главном соревновании года. В активе наших земляков два первых места. Их завоевали А.Корзун (бег 100м.) и А.Козловский (бег 400м. с/б).

Второе место в толкании ядра занял Ю.Белов.

Дважды третьими были эстафетные команды в беге 4х400м.

В мужской выступали: Д.Жариков, А.Козловский, А.Корзун, О.Гайдай

В женской: Н.Семкина, Н.Котикова, Ю.Чирская, Н.Никитенок

В командном зачете академические легкоатлеты стали четвертыми в своей группе.

Иван МОРОЗОВ

КОЖАННЫЙ МЯЧ



ВТОРЫЕ В ОБЛАСТИ

Юные футболисты младшей возрастной группы (1995-96 г.г.р.) стали вторыми в областном турнире клуба "Кожаный мяч". В составе горецкой команды, которой руководил тренер Вячеслав Болдовский, выступали ребята из Гимназии, школ №3 и №4.

В финальной части турнира наши футболисты обыграли Могилевский район – 2:0 (оба гола забил И.Пуков) и Шклов – 4:0 (голы: Пуков-2, Чудовский, Латышев). В матче за первое место сильнее оказалась команда Могилева, победившая горецких футболистов со счетом 5:1 (у нас гол забил И.Пуков)

Лауреатами в личных номинациях стали Игорь Пуков, получивший приз лучшего нападающего и Алексей Чудовский – лучший защитник турнира.

Иван МОРОЗОВ

Трагедия

Проклятое место

ВЫЕЗЖАЯ ИЗ ГОРОК НА ЛЕНИНО БУДЬТЕ БДИТЕЛЬНЫ!

На минувшей неделе снова дал знать о себе перекресток дорог из Горок в Ленино и объездной из Орши на Мстиславль. Очередной водитель (на этот раз управлявший автомобилем "Ауди") не пропустил "Фольксваген – Пассат". Машины столкнулись. Погибла женщина.

Этот перекресток дает о себе знать слишком уж часто. Что-то там не так: не то с устройством, не то со знаками, не то, как говорят некоторые, с аурой – дескать, проклятое место.

Мы попытаемся разобраться в этом, проконсультировавшись со специалистами и проведя собственный мониторинг ситуации. Сегодня же приведем комментарий человека, чей водительский стаж насчитывает более двадцати лет.

- Заметьте, - говорит Александр, - что виновниками аварий чаще всего здесь становятся иногородние водители, плохо знающие этот участок дороги. Однако я бы только их винить не стал. Дело в том, что повсюду объездная дорога является главной и любой водитель, даже опытный, едет по ней "на автомате". Здесь же главной является дорога из Горок на Ленино. Малейшая невнимательность и – столкновение. Однако просто поменять знаки по принципу "плюс на минус" тоже нельзя. Там и видимость плохая и уклон – машины едут быстро. В идеале, конечно там нужно строить развязку, но кто это будет делать – дорого ведь. Хотя жизнь человека еще дороже.

Иван МОРОЗОВ



В таких авариях гибнут и люди и машины

Некаторыя палітвязьні крытычна ставяцца да ўдзелу ў Кангрэсе

Для ўдзелу ў Кангрэсе дэмакратычных сілаў, які пройдзе ў Менску 26 – 27 траўня, запрошаныя 273 VIP-пэрсоны –вядомыя ў Беларусі асобы. Зь іх толькі былыя палітвязьні атрымаюць мандаты дэлегатаў форуму і права на галасаваньне. Усе астатнія VIP-пэрсоны будуць гасьцямі форуму. Як ставяцца былыя палітвязьні да вызначанай ім прывілеі?

Былыя палітвязьні Міхаіл Марыніч, Вячаслаў Сіўчык і Аляксей Шыдлоўскі, зь якімі я гаварыў учора ўвечары, пра запрашэньне іх на Кангрэс даведаліся ад мяне. І яшчэ адна рэч аб'яднала гэтыя размовы – кожны зь іх сказаў, што пакуль ня можа даць дакладнага адказу пра свой удзел у форуме. Чаму?

Вячаслаў Сіўчык: "Вельмі насьцярожвае тое, што адбываецца цяпер. Кангрэсы разглядаюць толькі пэрсанальныя пытаньні".

Вячаслаў Сіўчык тлумачыць сытуацыю так:

"Кангрэс дэмакратычных сілаў быў створаны яшчэ ў асноўным высілкамі Генадзя Карпенкі. У тым першым варыянце самая галоўная ідэя – менавіта аб'яднаньне ўсіх людзей, якія выступаюць супраць дыктатуры, за дэмакратыю, за Беларусь.

На жаль, вельмі насьцярожвае тое, што адбываецца цяпер. Апошнія кангрэсы часьцей за ўсё разглядаюць толькі пэрсанальныя пытаньні".

Аляксей Шыдлоўскі таксама пакуль што не вызначыўся:

"Тое, што да палітвязьняў такім чынам ставяцца – гэта, відавочна, станоўчая рыса. Лічу, што ў такім кірунку і трэба разьвіваць адносіны з пацярпелымі.

Пра тое, ці пайду я на Кангрэс і як буду галасаваць, не магу пакуль што адказаць. У прынцыпе, я не зьбіраўся на Кангрэс. Ёсьць свае на тое меркаваньні".

Міхаіл Марыніч: "Калі гаварыць сумленна, то я ня бачу сэнсу ў гэтым Кангрэсе".

Міхаіл Марыніч гаворыць, што ў яго яшчэ ёсьць час усё ўзважыць. Але пакуль што ён схіляецца да ігнараваньня Кангрэсу:

"Калі гаварыць сумленна, то я ня бачу сэнсу ў гэтым Кангрэсе. Пакуль я не знаходжу ў парадку дня, што ёсьць шляхі вырашэньня галоўнай мэты – пазбаўленьня ад дыктатуры. Нават ня бачу, што ёсьць намеры разгледзець зьмены ў выбарчае заканадаўства".

Уладзімер Глод, Радыё Свабода

Польшча: архівы адкрыюць цалкам

У Польшчы будуць цалкам адкрытыя архівы камуністычных спэцслужбаў – пра гэта заявіў прэм'ер-міністар гэтай краіны Яраслаў Качынскі.

Дагэтуль кіруючая ў Польшчы партыя "Права і справядлівасьць" выказвалася супраць поўнага адкрыцьця архіваў часоў ПНР, бо ў гэтых матэрыялах могуць знаходзіцца "зьвесткі асабістага характару", якія маглі б пакрыўдзіць людзей, ніяк з працэсам люстрацыі не зьвязаных.

Аднак пасьля таго, як Канстытуцыйны суд прызнаў, што новы "Закон аб люстрацыі" часткова не адпавядае Канстытуцыі, "Права і справядлівасьць" зьмяніла меркаваньне.

"Калі толькі такое выйсьце з сытуацыі мае падтрымку, а Канстытуцыйны суд заняў вельмі радыкальную пазыцыю, дык трэба гэтай дарогай пайсьці", – заявіў лідэр партыі, прэм'ер-міністар Яраслаў Качынскі.

Я.Качыньскі: "Архівы трэба адкрыць такім чынам, каб там маглі працаваць гісторыкі, іначай люстрацыю правядуць сродкі масавай інфармацыі".

Паводле ягоных словаў, "архівы трэба адкрыць такім чынам, каб там маглі працаваць гісторыкі", бо "іначай люстрацыю правядуць сродкі масавай інфармацыі", якія будуць цікавіцца найперш знанымі асобамі.

Дагэтуль у Польшчы люстрацыйныя заявы, дзе трэба было напісаць, супрацоўнічала дадзеная асоба са спэцслужбамі ці не, павінны былі падаваць перадусім дэпутаты, высокапастаўленыя дзяржаўныя чыноўнікі і кіраўнікі прадпрыемстваў, дзе большасьць акцыяў мае дзяржава.

Аляксей Дзікавіцкі, Радыё Свабода

ПЯТАЯ КАЛОНКА

УМОЎНА-ДАТЭРМІНОЎНАЕ ВЫЗВАЛЕНЬНЕ СТАТКЕВІЧА

22 траўня суд на выязным паседжаньні ў Мар'інай Горцы прыняў рашэньне аб умоўна-датэрміновым вызваленьні Мікалая Статкевіча.

Як паведаміў Рацыі паплечнік палітыка Аляксандар Арэстовіч, Статкевіч, як і Павал Севярынец, вызвалены "за прыкладныя паводзіны".

М. Статкевіч атрымаў два гады абмежаваньня волі "за арганізацыю вулічных дэманстрацыяў пратэсту супраць фальсыфікацыі вынікаў выбараў і рэфэрэндуму 2004 году".

Тэрмін адбываў у вёсцы Блонь Пухавіцкага раёну.

Радыё Рацыя

ПАВАЛ СЕВЯРЫНЕЦ ВЫЗВАЛЕНЫ

На судовым паседжаньні ў Наваполацку прынятае рашэньне аб умоўна-датэрміновым вызваленьні палітыка Паўла Севярынца "за прыкладныя паводзіны".

Нагадаем, што ў жніўні 2005 году Павал Севярынец быў асуджаны на два гады абмежаваньня волі "за арганізацыю вулічных дэманстрацый пратэсту супраць фальсыфікацыі вынікаў выбараў і рэфэрэндуму 2004 году". Тэрмін зняволеньня мусіў скончыцца 15 жніўня гэтага году.

Пасьля суду Павал Севярянец заявіў Рацыі, што пляну адразу ўключыцца ў працу: "Два гады адпачываў... Трэба працаваць".

23 траўня аб 11.00 на сядзібе Партыі БНФ ён мае намер правесьці прэсавую канфэрэнцыю, прысьвечаную ягонаму вызваленьню.

Радыё Рацыя

Магілёў: затрыманыя ўдзельнікі акцыі супраць адмены ільготаў на волі

12 чалавек, якіх затрымалі падчас моладзевай акцыі супраць адмены ільготаў, адпушчаныя з пастарунку Ленінскай управы ўнутраных спраў Магілёва. На ўсіх затрыманых міліцыянты склалі пратаколы апытаньня. У зьняволеньні актывісты прабылі больш за дзьве гадзіны.

Сярод затрыманых было трое непаўналетніх, а таксама Крысьціна Шацікава, Сяргей Гіркін, Таццяна Буланава ды трое журналістаў Ганна Ільіна, Андрэй Дзьвігун ды Ігар Барысаў.

Са слоў актывістаў, іх затрымалі, каб перапыніць акцыю пратэсту і не дазволіць да яе далучыцца большай колькасьці моладзі.

У акцыі пратэсту ўзялі ўдзел больш за пяцьдзесят чалавек. Яна праходзіла на плошчы Зорак, непадалёк ад будынку гарвыканкаму. Удзельнікі зьбіралі подпісы супраць адмены ільготаў ды раздавалі незалежныя выданьні.

За ўдзельнікамі акцыі акрамя міліцыянтаў сачылі выкладчыкі магілёўскіх ВНУ, у тым ліку і намесьнік дэкана па ідэалягічнай рабоце Магілёўскага дзяржаўнага ўнівэрсытэту Дзьмітры Рагаўцоў.

Радыё Свабода

Пахавальны звон па глябальных амбіцыях афіцыйнага Менску

Неабраньне Беларусі ў склад Рады ААН у правох чалавека – буйная параза беларускай дыпляматыі. Ёсьць некалькі акалічнасьцяў, якія робяць яе асабліва крыўднай для афіцыйнага Менску.

Ад Беларусі чакаюць выкананьня эўрапейскіх стандартаў

Беларусь у галасаваньні абышла Босьнія, краіна якая вылучыла сваю кандыдатуру за два дні да выбараў сябраў Рады. Іншыя краіны: Эгіпет, Ангола і Катар, супраць сяброўства якіх у Радзе таксама рэзка выступалі праваабаронча арганізацыі, былі лёгка абраныя ў яе склад.

У вызначэньні "апошняя дыктатура Эўропы", якую зараз часта ўжываюць адносна Беларусі, найгоршае – менавіта спалучэньне, тут сапраўды дзейнічае "падвойны стандарт": ад Анголы ці Эгіпту па вялікім рахунку ніхто асаблівых дасягненьняў у галіне правоў чалавека і не чакае, а Беларусь мераюць усё ж іншым стандартам, эўрапейскім.

Таму і супраціў беларускай кандыдатуры з боку праваабарончых арганізацыяў і многіх урадаў, прыхільных ідэі правоў чалавека, быў асабліва жорсткім, а высілкі дыпляматыі гэтых краінаў, асабліва настойлівымі.

Трэці сьвет таксама не падтрымаў афіцыйнага Менску

Беларускія ўлады звычайна паблажліва рэагуюць на рэзалюцыі розных эўрапейскіх інстытуцыяў, маўляў, чаго ад іх чакаць. Але наконт сяброўства ў Радзе ААН у правох чалавека галасавалі ўсе дзяржавы, што ўваходзяць у ААН – ад Кітаю да Андоры. Пры ўсёй умоўнасьці паняцьця "міжнародная супольнасьць" што можа быць бліжэй да яго, чым супольнае рашэньне ўсіх краінаў сьвету?

І тое, што супраць кандыдатуры Беларусі выказалася пераважная іх большасьць, а зусім ня толькі заходнія дзяржавы, гучыць пахавальным звонам па прэтэнзіям Аляксандра Лукашэнкі узначальваць нейкія блёкі і аб'яднаньні краінаў "трэцяга сьвету". Галасаваньне паказала, што ня надта яны імкнуцца падтрымліваць свайго эўрапейскага сябра нават у такім, па вялікім рахунку, дробным пытаньні.

Чаму выйграла Босьнія?

Складана сказаць, наколькі самастойна Босьнія прыйшла да намеру ў апошні момант вылучыць сваю кандыдатуру. Але як бы то ні было, супернік Беларусі атрымаўся надзвычай моцны. І ня толькі таму, што ад жахлівых ваенных зьверстваў і поўнага бязладзьдзя Босьнія здолела прыйсьці да стану больш-менш прыстойнага. Ня выключана, што ключавую ролю пры галасаваньні згулялі сымпатыі да яе з боку мусульманскіх краінаў. Яны ў пэўным сэнсе таксама падыходзяць да Беларусі з эўрапейскім стандартам, у тым сэнсе , што ёсьць яны, ёсьць свае, а ёсьць Эўропа, у тым ліку і Беларусь – ня зусім свае.

Што страціў афіцыйны Менск?

Цяжка сказаць, што асабліва выйграла б Беларусь, калі б апынулася ў Радзе. На працягу некалькіх гадоў яна адмаўлялася канструктыўна супрацоўнічаць зь ёй, спэцыяльнага дакладчыка Рады па Беларусі Адрыяна Севярына нават ніводнага разу не пусьцілі ў краіну. Калі б стала б Беларусь сябрам Рады, то яна магла б крыху больш эфэктыўна тарпэдаваць разгляд беларускага пытаньня на пасяджэньнях гэтай установы, магла б спрабаваць прадухіляць асуджэньне Радай сяброў афіцыйнага Менску: Вэнэсуэлы, Ірану да іншых.

Але сярод 46-і іншых і вельмі розных сябраў Рады яе голас ня быў бы надта гучным. Пра тое, што Беларусь ня надта ўмее скарыстоўваць міжнародныя магчымасьці, сьведчыць дзейнасьць палаты прадстаўнікоў у Парлямэнцкай асамблеі АБСЭ. Гэтае месца палата атрымала ў 2003 годзе, тады шмат хто казаў пра небясьпеку легітымізацыі беларускага рэжыму. Але хто з тае пары чуў пра дасягненьні беларускай дыпляматы праз гэтае сяброўства?

Выйгрыш ад посьпеху быў бы значна меншым, чым пройгрыш ад няўдачы, якую афіцыйны Менск пацярпеў сёньня.

Юры Дракахруст, Радыё Свабода

КІРАЎНІКОМ РУХУ "ЗА СВАБОДУ!" АБРАНЫ АЛЯКСАНДАР МІЛІНКЕВІЧ

Намеснікамі кіраўніка сталі Віктар Карняенка і Юрась Губарэвіч. Удзельнікі ўстаноўчага сходу абрала Раду з прадстаўнікоў усіх рэгіёнаў Беларусі.

Сябра арганізацыйнага камітэту Павал Мажэйка паведаміў, што удзельнікі ўстаноўчага сходу пасьпелі прыняць статут і абраць кіроўныя органы руху "За Свабоду!" да таго, як у памяшканьне ўварваліся міліцыянты.

Міліцыянты прызналіся: яны не чакалі, што зь першага разу ім не адчыняць дзьверы.

Паводле словаў Мілінкевіча, удзельнікі ўстаноўчага сходу зразумелі, у чым справа і таму ад пачатку правялі галасаваньне, а пасьля адамкнулі дзьверы.

Супрацоўнікі МУС паведамілі, што калі паступіць званок пра бомбу, сапёры прыедуць паўторна. Пакуль яны правяраюць іншыя памяшканьні будынка па Будзённага 48а.

Міліцыянты паведамілі, што ўвесь будынак эвакуяваны.

У суседніх пакоях месьціцца грамадзкая арганізацыя "Польска матеж школьна". З раніцы там адбываліся іспыты па польскай мове.

У гэтым жа будынку знаходзіцца Генэральнае консульства Рэспублікі Польшча.

Міліцыянты папярэдзілі ўдзельнікаў устаноўчага сходу руху "За свабоду!", што не даволяць ім болей сёньня зайсьці ў памяшканьне. Супрацоўнікі МУС патлумачылі, што пошук выбуховай прылады можа цягнуцца два дні.

Сяргей Астраўцоў, Радыё Свабода

Куды падзеліся подпісы дэлегатаў кангрэсу?

У Магілёве стварылі адмысловую камісію, якая зоймецца праверкай фактаў зьнікненьня часткі подпісаў у 44 кандыдатаў у дэлегаты Кангрэсу дэмакратычных сілаў ад Магілёўшчыны. Ініцыявалі стварэньне камісіі дэлегаты, якія байкатавалі рэгіянальную канфэрэнцыю дэмакратычных сілаў Магілёўшчыны.

Паводле ініцыятараў стварэньня камісіі, падчас кампаніі вылучэньня дэлегатаў 67 чалавек назьбіралі ў сваю падтрымку 300 подпісаў выбарцаў. Усе яны былі зарэгістраваныя Магілёўскай назіральнай камісіяй дэлегатамі кангрэсу.

Пасьля праверкі сабраных подпісаў Цэнтральнай назіральнай камісіяй мандат дэлегата атрымалі толькі 23 чалавекі.

15 траўня палітычная рада дэмакратычных сілаў і Цэнтральная назіральная камісія пагадзіліся стварыць у Магілёве адмысловую камісію дзеля праверкі фактаў зьнікненьня подпісаў.

Адзін з ініцыятараў стварэньня камісіі Зьміцер Салаўёў паведаміў "Свабодзе", што ў ейны склад увайшлі прадстаўнікі шасьці магілёўскіх рэгіянальных арганізацыяў палітычных партыяў.

"Цэнтральная назіральная камісія перадасьць нам усе дакумэнты, неабходныя для працы, подпісы ды пратаколы. Мы павінны даць справаздачу палітрадзе і мандатнай камісіі, якая будзе на кангрэсе".

У Цэнтральнай назіральнай камісіі перакананыя, што нават калі выявяцца хібы, паўторнай рэгіянальнай канфэрэнцыі дэлегатаў кангрэсу ад Магілёўшчыны ня будзе. А менавіта гэтага дамагаюцца магілёўскія дэмакраты.

Гаворыць старшыня Цэнтральнай назіральнай камісіі Ўладзімер Лапковіч:

"Новага сходу праводзіцца ня будзе, але дэлегатам, якія будуць ці то ўзноўленыя, ці тыя, якія байкатавалі мінулы сход, будзе дадзена магчымасьць таксама прагаласаваць".

Вынікі працы Цэнтральнай назіральнай камісіі магілёўскія дэмакраты рэзка скрытыкавалі. Яе абвінавацілі ў парушэньні дамоўленасьцяў і ўмоваў вылучэньня дэлегатаў на кангрэс.

Нагадаем: дэлегаты ад Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі, Партыі БНФ ды незарэгістраванай Партыі свабоды і прагрэсу байкатавалі рэгіянальную канфэрэнцыі, якая прайшла ў сярэдзіне траўня бяз кворуму.

Радыё Свабода

За ўдзел віп-пэрсонаў у Кангрэсе будуць галасаваць асобна

На паседжаньні Палітрады аб'яднаных дэмсілаў вырашана скласьці сьпіс віп-пэрсонаў, якія будуць запрошаныя ў якасьці дэлегатаў. Свае прапановы ўжо падалі суб'екты кааліцыі, грамадзкія ініцыятывы і аб'яднаньні. Па кожнай кандыдатуры пройдзе адкрытае галасаваньне.

Сябра Палітрады Анатоль Лябедзька сказаў:

"Насупраць кожнай асобы структура будзе выстаўляць плюс ці мінус. Той, хто атрымае ўсе плюсы, й будзе дэлегатам кангрэсу".

Аляксандар Мілінкевіч спадзяецца, што будзе ўхвалены сьпіс, прадстаўлены Радай беларускай інтэлігенцыі:

"Гэта ж натуральна, што пісьменьнікі, мастакі, калі яны будуць на Кангрэсе, гэта ня толькі ўпрыгожвае кангрэс, а гэта робіць яго прэстыжным, падымае рэйтынг гэтага кангрэсу. На жаль, усе думаюць пра барацьбу ў нейкіх фракцыях, за нейкія месцы ў кіраўніцтве. Я не падзяляю гэтага пункту гледжаньня. Было б сорамна, калі б не прайшлі віп-пэрсоны, але маю надзею, што такое не здарыцца".

Палітвязьні змогуць вызначыць асобу, якая будзе мець паўнамоцтвы і статус дэлегата кангрэсу.

Таксама Палітрада прыняла ў чарговым чытаньні рэглямэнт. Старшыня АГП Анатоль Лябедзька патлумачыў:

"Гэта будзе рэглямэнт гэтага Кангрэсу і будзе такая рэкамэндацыя – далей распрацаваць рэглямэнт як стала дзейнай структуры".

Адносна парадку дня Кангрэсу вырашана, што ён, між іншым, будзе ўключаць выступы старшыні Палітрады А.Мілінкевіча, старшыні Нацыянальнага камітэта А.Лябедзькі, кіраўніка штабу С.Калякіна і прадстаўніка Аляксандра Казуліна.

Галасаваньне ў ААН – камэнтары палітыкаў Алена Струвэ, Менск Беларусь ня трапіла ў склад Рады ААН у правах чалавека. Як заявіў журналістам сталы прадстаўнік ЗША ў ААН Залмай Халілдзад, "галасаваньне ў чацьвер стала выдатным знакам рэфармаваньня Рады правоў чалавека, якое так неабходна".

Паводле амэрыканскага амбасадара ў ААН Залмая Халілдзада, "у вачох усясьветнай супольнасьці выбары прадэманстравалі відавочны прагрэс Босьніі й Герцагавіны, якая ў сымпатыях да сябе апярэдзіла Беларусь"

"Я асабліва хачу падзякаваць сваім калегам за выбар не на карысьць Беларусі, якую называюць апошняй дыктатурай у Эўропе", – падкрэсьліў у часе прэсавай канфэрэнцыі Халілдзад.

Камэнтуючы вынікі галасаваньня, харвацкае выданьне Javno піша пра "перамогу заходніх краін, якія ў самы апошні момант пераканалі Босьнію выставіць сваю кандыдатуру і такім чынам супрацьстаяць уступу ў Раду ААН Беларусі".

Амэрыканскае выданьне New York Times прыводзіць камэнтар Стыва Кроўшаў – прадстаўніка праваабарончай арганізацыі Human Rights Watch, якая напярэдадні галасаваньня заклікала ўдзельнікаў Генасамблеі не аддаваць свае галасы за Беларусь.

"Парушальнікі правоў чалавека ня могуць быць сябрамі Рады. У Беларусі робіцца перасьлед апазіцыі, няма свабоды слова і прэзыдэнцкія выбары не былі абсалютна свабоднымі", – заявіў Стыў Кроўшаў.

Як падае амэрыканскае выданьне, напярэдадні выбараў праваабаронцы Human Rights Watch неаднойчы выказвалі свае пратэсты супраць трох іншых кандыдатаў у Раду – Анголу, Эгіпет і Катар, называючы гэтыя краіны аўтарытарнымі рэжымамі, несумяшчальнымі з прадстаўніцтвам у міжнароднай праваабарончай структуры.Тым ня менш, у чацьвер ўсе тры краіны былі абраныя ў Раду ААН.

Сябра ПА РЭ швайцарскі палітык Андрэас Грос, які, дарэчы, паставіў свой подпіс пад зваротам ПА РЭ супраць абраньня Беларусі, ставіцца да сёньняшняга складу Рады ААН дастаткова крытычна. Ён лічыць, што ў гэтай праваабарончай структуры "хапае сяброў, якія яе дыскрэдытуюць".

"Толькі павага да дэмакратыі і правоў чалавека можа выратаваць сёньня рэпутацыю Рады ААН. Яе склад, мякка кажучы, ня самы аптымальны. Нічога не застаецца, як узгадаць прымаўку: вучні не адразу становяцца майстрамі. Што да вынікаў галасаваньня па ўсходнеэўрапейскай групе, то я іх збольшага падтрымліваю. Я маю на ўвазе тое, што не прайшла Беларусь, дакладней, рэжым Лукашэнкі", – заявіў Свабодзе Андрэас Грос.

Як падае брытанскае выданьне Monsters and Critics, пра сваю падтрымку Беларусі адкрыта заявіў сталы прадстаўнік Судану ў ААН Судану Абдалмахмуд Махамад. Ён заявіў, што адмыслова прыбыў у чацьвер на Генасамблею, каб аддаць свой голас за Беларусь. "Мы лічым, што лепш супрацоўніцтва, чым канфрантацыя. Калі вы супрацьстаіце Беларусі, гэта нікольні не дапаможа правам чалавека ўвогуле", – заявіў амбасадар краіны, якую многія праваабарончыя арганізацыі крытыкуюць за бясконцы генацыд у Дарфуры.

Што да прадстаўнікоў місіі Беларусі ў ААН, то яны пакуль не далі ніякіх афіцыйных камэнтароў адносна вынікаў учорашняга галасаваньня.

На пытаньне, на што разьлічвала беларуская дыпляматыя, калі прасоўвала сваю краіну менавіта ў Раду ААН у правах чалавека, мы папрасілі адказаць колішняга прадстаўнік беларускай місіі у Нью-Ёрку Генадзя Бураўкіна.

"Я думаю, што беларускія дыпляматы, безумоўна ,ведалі, што вакол гэтай ініцыятывы будуць нейкія дыскусіі і нават дзеяньні, – кажа Бураўкін. – Тыя зь іх, каго я ведаю – гэта дастаткова разумныя, сур'ёзныя і дасьведчаныя людзі. Бясспрэчна, яны маглі прадбачыць, што будзе. Калі яны на гэта пайшлі, то я думаю, на штосьці разьлічвалі. Прадстаўлены два месцы, відаць, вялікага імкненьня, дарыйце за фармулёўку, у праваабарончую Раду з гэтай групы не было... Напэўна рабіўся разьлік: мы туды пройдзем. Было спадзяваньне, што ня будзе канкурэнцыі, іншых кандыдатаў. А чаму менавіта гэтая Рады была абраная Менскам? Ну, думаю, для таго, каб пасьля можна было сьмела заяўляць: вы нас крытыкуеце за тое, што ў нас няддобра з правамі чалавека, а нас сама Арганізацыя Аб'яднаных Нацый уключыла ў Раду ўправах чалавека"

У часе ўчорашняга паседжаньня Генэральнай Асамблеі Аб'яднаных Нацый былі абраныя 14 чарговых сяброў гэтага праваабарончага органу. Ва ўсходнеэўрапейскую групу трапілі Славенія ды Босьнія-Герцагавіна, якія ў чэрвені заменяць Чэхію і Польшчу. Змаганьне за месцы ва ўсходнеэўрапейскай сэкцыі праходзіла ў два туры. Калі Славенія набрала неабходную колькасьць галасоў у хадзе першага туру, то для Беларусі і Босьніі спатрэбілася паўторнае галасаваньне. У выніку Беларусь атрымала 72 галасы, Босьнія – 112.

Алесь Дашчынскі, Радыё Свабода

ПЯТАЯ КАЛОНКА

ПАЛІТВЯЗЬНІ РЫХТУЮЦЬ ДЛЯ КАНГРЭСУ АЛЬТЭРНАТЫЎНУЮ СТРАТЭГІЮ

Палітвязень Павал Севярынец скарыстаў чарговы адпачынак дзеля таго, каб скаардынаваць пазыцыю так званых "хімікаў" адносна Кангрэсу дэмакратычных сілаў і суду над "маладафронтаўцамі". Павал Севярынец кажа, што нязгодны са стратэгіяй, якую падрыхтавалі ініцыятары форуму, і што зь ім салідарныя іншыя палітвязьні.

"Хімік" Павал Севярынец прыехаў дамоў у адпачынак 16-га траўня, а вярнуцца ў вёску Малое Сітна, дзе ён адбывае пакараньне, мусіць ў нядзелю 20-га. Павал кажа: усе чатыры дні на волі прысьвеціць Кангрэсу аб'яднаных дэмакратычных сілаў, прызначанага на 26-27 траўня, і судам над актывістамі "Маладога фронту".

"Зараз перада мной сьпіс зь некалькіх дзясяткаў тэлефонаў. Тэлефаную ў асноўным па "маладафронтаўцах". Наступныя тры гадзіны займаюся абтэлефаноўваньнем, а пад вечар буду рыхтаваць тэзы да выступу на кангрэсе, які мяне папрасілі падрыхтаваць. Ён будзе тычыцца стратэгіі дзейнасьці аб'яднаных дэмакратычных сілаў. Той варыянт, які падрыхтаваны палітычнымі партыямі, мне здаецца бязвольным. Безумоўна, яму патрэбна моцная альтэрнатыва".

Вялікай памылкай апазыцыі Павал Севярынец лічыць як ранейшыя стаўкі на Захад ці Ўсход, так і сёньняшнія на супрацоўніцтва з рэжымам. На думку актывіста, абапірацца трэба на простае беларускае насельніцтва. "Калі людзі будуць адчуваць салідарнасьць, яны змогуць абараніць свае правы", -- кажа Павал Севярынец.

Другі "хімік", вядомы сацыял-дэмакрат Мікалай Статкевіч таксама нязгодны са стратэгіяй "супрацоўніцтва з ўладай" і мяркуе зьвярнуцца да ўдзельнікаў кангрэсу з асабістай прапановай.

"Тая стратэгія, якая прапануецца, была распрацаваная ў кулюарах, яна ўзьнікла раптоўна ў сярэдзіне красавіка. Мы яе крытыкавалі, зрабілі аналіз і раздалі яго сябрам Палітрады, але тыя на крытыку не адрэагавалі. Таму мы мусілі распрацаваць альтэрнатыўную стратэгію. Спадзяемся, у нас будзе магчымасьць яе прэзэнтаваць. Мяркую, мы з Паўлам Севярынцам ды іншымі сябрамі Эўрапейскай кааліцыі зробім выступы. Калі ня будзе магчымасьці відэазапісу, нашы выступы проста зачытаюць".

Актывісты "Маладога фронту" ў гэтыя дні рыхтуюцца да судовых працэсаў над іх сябрамі, якіх будуць судзіць за ўдзел ў незарэгістраванай арганізацыі. Нагадаю, ў Менску 30-га траўня пачнуць судзіць Насту Палажанку, Зьмітра Хведарука, Барыса Гарэцкага, Алега Корбана, Аляксея Янушэўскага. Актывіст Артур Фінькевіч, які адбывае "хімію" ў Магілёве заўважыў: перасьлед супадае па часе зь іспытамі ў навучальных ўстановах.

"Гэта робіцца дзеля таго, каб зьменшыць падтрымку на працэсах", -- мяркуе Артур Фінькевіч.

У працілагу гэтым намерам актывісты плянуюць правесьці адмыслова падрыхтаваныя прэсавыя канфэрэнцыі ў розных гарадах Беларусі.

Алег Грузьдзіловіч, Радыё Свабода

РОДИЛИСЬ

28 мая
Жозеф ГИЛЬОТЕН (ГИЙОТЕН)/ Joseph Ignace GUILLOTIN/(1738-26.3.1814)
французский врач, масон. Он усовершенствовал существовавшие раньше механические устройства для отрубания головы (так казнили, например, в Шотландии приговоренных к казни аристократов). Доктор Гильотен был членом Национального Собрания и провел очень демократический закон, что людям всех сословий, а не только благородным, голову следует отрубать только "машиной". В первый раз нож французской гильотины, как ее потом стали называть, убил разбойника 25 апреля 1792 года. Машина, стоявшая на Гревской площади, оказалась весьма удобной и высокопроизводительной. Она почти в одиночку справилась с якобинским террором 1793-94 годов, а потом даже отрубила головы инициаторам террора. Так и осталась гильотина официальным орудием казни во Франции. В последний раз она сработала в 1977 году. С 1981 года смертная казнь во Франции отменена.

29 мая
Эдме БУШАРДОН (1698)
французский скульптор (фонтан "Времена года" в Париже, статуя Купидона в Лувре).

30 мая
Карл Петер ФАБЕРЖЕ (1846-24.9.1920)
ювелир.

31 мая
Уильям Джеймс ПИРРИ (1847-7.06.1924)
ирландский кораблестроитель, руководивший крупнейшей судоверфью мира, создатель «Титаника».

1 июня
Жан МАРКЕТТ (1637)
французский миссионер, первооткрыватель Великих Озер.

2 мая
Пьетро Цезаро АЛЬБЕРТИ /Pietro (Peter) Caesaro ALBERTI/(1608-9.11.1655)
первый итальянец - житель Нью-Йорка, который звался в ту пору Новым Амстердамом. Начиная с Колумба, итальянцы многое сделали первыми в Америке. Сегодня в Нью-Йорке каждый седьмой имеет итальянские корни, потому не стоит удивляться, что зафиксирован и тот факт, когда сюда на постоянное место жительства прибыл их первый соотечественник. Случилось это 30 мая 1635 года (многие источники говорят о 2 июня, эта дата даже выбита на памятном камне, но похоже, что это перекрытие с днем рождения). Его отец был казначеем у венецианского дожа, торговый дом Альберти относился к самым процветающим флорентийским семействам. Перебраться в Новый Свет Пьетро, ставшего здесь Питером, пришлось из-за религиозного преследования, так как он был кальвинистом. Он приплыл на голландском корабле, женился здесь на голландской девушке, у них было семеро детей и умерли они в один день - когда на город напали индейцы.

3 июня
Генри ШРАПНЕЛЬ (1761)
английский изобретатель, придумавший артиллерийский снаряд с картечными пулями.

ПОНЕДЕЛЬНИК, 28 МАЯ

1-ЫЙ

6.10 "Набережная Орфевр, 36". Т/с.
7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 23.55 Новости.
7.05, 8.10 Доброе утро, Беларусь!
7.20, 8.20 Ты увидишь Первый!.
7.25, 8.25, 14.50 Деловая жизнь.
7.45, 18.50, 0.15 Зона Х.
8.50 Выпускной экзамен по белорусскому и русскому языкам за период обучения на уровне общего среднего образования в общеобразовательных и специальных учреждениях.
9.05, 19.55 Т/с "Отчаянные домохозяйки".
9.50 "Панорама недели".
11.00, 17.40 Т/с "Любовь как любовь".
12.10 Х/Ф "Блокпост".
13.55 В мире моторов.
14.25 Вокруг планеты.
15.15, 19.20 Новости региона.
15.30 Мультфильм.
15.40 Культурные люди.
16.05 Фигуры.
16.35 "Набережная Орфевр, 36". Т/с. Заключительная серия.
19.35 Время спорта.
21.00 Панорама.
21.40 Конкурс красоты "Мисс Вселенная-2007".
0.20 Футбол. Лига чемпионов.
0.50 Все стихии.

ОНТ

7.00, 7.30, 8.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30, 23.05 Наши новости.
7.05 "Наше утро".
9.05 Контуры.
10.10 "Дыхание планеты".
11.05, 13.05, 16.10, 18.15, 21.00, 23.20 Новости спорта.
11.10 Фильм "Перстень наследника династии".
13.10 Х/ф "Свой, чужой".
14.05 "Детективы".
14.35 "Контрольная закупка".
15.05 "Лолита. Без комплексов".
16.15 "Шутка за шуткой".
17.00 "История песни".
18.20 Т/с "Друзья".
18.55 Жди меня.
20.00 Время.
21.05 "Выбор".
22.00 Т/с "Остаться в живых".
23.25 Х/ф "Безумные дни".
1.05 "Бойцовский клуб".

РОССИЯ

7.00 Доброе утро, Россия!.
9.15 "Валентина Леонтьева: сказка и быль".
10.00 "Комната смеха".
11.00, 14.00, 17.00, 19.00 Вести.
11.30 Вести- Москва.
11.50 "Частная жизнь".
12.45 Т/с "Полосатое лето", Россия, 2003 г.
13.40 Дежурная часть.
14.20 Местное время.
14.40 Х/ф "Великолепная афера"
